# «Революция пришла, она меня захватила...»

## Два текста, объединенные одной судьбой



Олег ЯНОВСКИЙ,
кандидат
исторических наук,
профессор

**В октябрьские дни отмечается 90-летие символа отечественного высшего образования – Белорусского государственного университета. В ряду отцов-основателей БГУ первым среди равных был историк-славист Владимир Иванович Пичета. С 1918 года он одним из первых включился в работу по осмыслению в целом белорусской истории и культуры. В 1918–1921 годах участвовал в создании и руководстве Белорусским научно-культурным обществом, преподавал в Белорусском народном университете (в прочитанном им курсе под названием «История белорусского народа» поднимался ряд вопросов, которые ранее не затрагивал никто из историков), был экспертом на Рижских мирных переговорах, работал в комиссиях по организации Белорусского государственного университета.**

Разумеется, в белорусскую историю В.И. Пичета вошел, прежде всего, как первый ректор первого национального университета: в начале 1921 года власти наметили на место ректора именно его (обсуждалась и кандидатура Е.Ф. Карского) как «по своим политическим взглядам близкого к коммунистам». По воспоминаниям одного из соратников В.И. Пичеты по строительству БГУ профессора-историка А.А. Савича, на посту ректора «пришлось совмещать в себе и организатора научной жизни в новооткрытом университете, и администратора-хозяйственника, и профессора».

Многие известные ученые ехали в Минск из различных университетов России (и не только) на работу в университет только потому, что их лично приглашал ректор. Но Владимир Иванович ориентировался на местную интеллигенцию, видя в ней залог того, что создаваемый БГУ станет по-настоящему белорусским. По его инициативе было решено ввести преподавание истории Беларуси в качестве общеобязательного предмета для всех факультетов БГУ, были заложены традиции изучения и преподавания славянской истории. В целом – углубленной подготовки национальных квалифицированных кадров педагогов, юристов и экономистов.

Владимир Иванович был одним из организаторов и активных членов Научного общества БГУ и действовавшего при БГУ Минского общества истории и древностей, постоянно нацеливая их членов на создание собственной белорусской истории. По его предложению в конце 1921 года был создан периодический научный орган университета «Працы БДУ». Пичета всемерно способствовал активизации научной деятельности студентов, стремясь направить ее в русло разработки наиболее актуальных для Беларуси вопросов. Под непосредственным руководством Владимира Ивановича было создано краеведческое общество БГУ. С именем ректора-историка связано становление архивного дела в Беларуси: пригодился его опыт работы в Центрархиве РСФСР.

### ОБ АВТОРЕ

ЯНОВСКИЙ Олег Антонович.

Родился в 1951 году в д. Кричики Минского района Минской области. В 1973 году окончил исторический факультет Белорусского государственного университета. С 1973 года работает в БГУ – лаборант музея истории, преподаватель, доцент, заместитель декана, декан исторического факультета, проректор, первый проректор (1999–2003). С 1998 года – заведующий кафедрой истории России исторического факультета.

Кандидат исторических наук (1981), профессор (2003).

Автор почти 250 публикаций по истории высшей школы Беларуси, истории интеллигенции, внешней политики средневековой России, десятков учебников и учебных пособий для школ и университетов.

Сфера научных интересов: история высшей школы, интеллигентоведение и университетоведение, история внешней политики России.

Владимир Иванович, выступая 12 апреля 1927 года на VIII Всебелорусском съезде Советов, высказался за создание в Беларуси аспирантуры. И в октябре в БГУ она была официально открыта, хотя сам профессор стал готовить аспирантов уже с 1925 года.

Правление БГУ под председательством В.И. Пичеты всемерно способствовало творческим командировкам в научно-образовательные центры СССР и за границу в целях развития научной работы и совершенствования учебного процесса, а также представления республики и университета в международном научном сообществе. В 20-е годы ученые университета посетили ряд стран Европы и Америки, работали в библиотеках, лабораториях, архивах, принимали участие в работе всесоюзных и международных научных конференций и съездов, с успехом представляя БГУ и белорусскую науку.

Университет во время ректорства В.И. Пичеты становился все более и более белорусским. Уже в первые учебные планы всех факультетов университета был введен белорусский язык, пристальное внимание уделялось переводу преподавания в БГУ на родной язык, который, согласно постановлениям правительства республики о проведении национальной политики, стал общеобязательным с 1925 года. Сам Владимир Иванович читал лекции на белорусском языке, который быстро изучил. Для пропаганды белорусского языка и культуры по инициативе В.И. Пичеты с первых дней работы БГУ были налажены публичные чествования белорусских писателей – Я. Купалы, Я. Коласа, М. Богдановича и др.

Самыми знаменательными событиями в жизни университета и его ректора были 5-летие со дня образования БГУ и совпавшее с ним 25-летие научно-педагогической и общественно-политической деятельности Владимира Ивановича. Эти юбилеи стали триумфом в жизни Пичеты: он был признан одним из наиболее видных деятелей советской Беларуси, удостоен звания «Заслуженный профессор Беларуси».

В 1920-е годы Владимир Иванович находился в эпицентре важнейших процессов общественно-политической и культурной жизни республики. Он был одним из инициаторов создания Института белорусской культуры, открыть который именно при БГУ не удалось из-за отсутствия необходимых средств и кадров. Но ректор был одним из разработчиков устава Инбелкульта как отдельного научного учреждения, а позже активным сторонником создания на его базе Белорусской академии наук (неоднократно высказывал эту мысль, выступая на заседаниях ЦИК и СНК Беларуси, на Всебелорусских съездах Советов 1924 и 1927 годов). Естественно, что Пичета был избран действительным членом обоих научных учреждений.



Владимир Иванович Пичета (1878–1947)

Творческое наследие В.И. Пичеты огромно. Многие из его работ еще не изданы. Их рукописи хранятся, прежде всего, в личном фонде академика В.И. Пичеты в Архиве РАН РФ (фонд 1548, имеющий три описи). В описи 1-й собрано рукописное наследие историка – почти 450 единиц хранения. Рукописи систематизированы тематически (например, история народов СССР, история славянских стран и т.д.). Большинство рукописей имеет незавершенный вид и поэтому для их осмысления требуется основательное археографическое и иное научное сопровождение. Но и во 2-й описи есть масса письменных работ историка по различным историческим направлениям (в том числе и белорусской истории). А в 3-й описи собрана переписка ученого, в которой много ценной информации, касающейся Беларуси. Поэтому, как представляется, белорусские историки обязаны отдать долг своему великому предшественнику и заняться подготовкой этих рукописей к изданию. Среди них:

1. История Белоруссии с древнейших времен до конца XIII в. (30 п.л., завершена автором в 1927 году).
2. Западный комитет (15 п.л., завершена в конце 30-х годов).
3. Литовско-польские унии в новейшей исторической литературе (1918–1939) (2 п.л.).
4. История Литвы с древнейших времен до наших дней (15 п.л.).
5. Учебник по истории Беларуси. В 2 т. (45 п.л., в соавторстве с Поликарповичем, А.П. Пьянковым, Лочмелем).
6. История Польши (изложение доведено до 60-х годов XIX века, хотя имеются хронологические и тематические пробелы).

7. Источниковедение истории Польши.
8. Польский вопрос в международных отношениях (1795–1848) (работа не завершена).
9. Масса статей Пичеты по белорусской тематике, в том числе написанные в годы Великой Отечественной войны, например, «Белорусский народ в семье славянских народов», «Белорусское поместье», «Аграрная реформа в действии», «Культурные связи белорусского народа с другими славянскими народами», «Политические связи Белоруссии с Россией», «Из истории военного прошлого белорусского народа», «Борьба белорусского народа с немецкими захватчиками» и др. В данном случае можно добавить, что в белорусской прессе в 1920-е годы были опубликованы десятки статей, интервью и иных материалов Владимира Ивановича. Большинство из них малоизвестно даже специалистам.

Потому есть предложение создать научно-творческий коллектив (при соответствующем финансировании) для подготовки к изданию хотя бы тех работ В.И. Пичеты, которые более всего не потеряли своей научной, социальной и познавательной ценности. Научно-творческие силы могли бы быть объединены – историкам БГУ и Института истории НАН Беларуси вполне по силам осуществить данный проект.

Представленные в данной публикации документы как бы совершенно разные по происхождению, тематике и внутреннему импульсу. Но их объединяет не только авторство Владимира Ивановича. Они отразили его убежденность в правоте своих научных и общественных позиций. И для этого историку не пришлось избрать сугубо академичный стиль повествования. Стиль очевидно констатирующий, когда факты-события как бы «нанизываются» на нить внутренних размышлений о судьбе своего детища – Белорусского университета и перспектив «строительства новой жизни». Оба текста написаны в совершенно разных условиях. Если первый стал результатом спокойного осмысления очевидных и позитивных результатов по созданию БГУ в условиях первых постреволюционных лет, то второй писался Владимиром Ивановичем не без подсказки тех, кто сфабриковал «академическое дело» по обвинению десятков гуманитариев в антисоветской деятельности. Называя себя «умственным пролетарием», узник ленинградских застенков НКВД Пичета в своем общественно-политическом кредо старается быть непредвзятым в оценках, хотя его видение белорусской действительности 1920-х годов очевидно не столько субъективно, сколько представлено «на нервах» и эмоциях, переполнявших растерянного интеллигента.

Нагрудный знак «Лауреат премии имени В.И. Пичеты»




Публикуемые тексты не новы для читателя, хотя уже сейчас достаточно сложно их отыскать и в оригинале, и в малотиражных перепечатках. В особенности это касается второго документа. Публикация «Мое общественно-политическое кредо» была впервые осуществлена на основе материалов персонального «дела Пичеты», хранящегося в архиве УФСБ РФ по Санкт-Петербургу и Ленинградской области (Д. № П-65245. Т. 19. Л. 258–261). В данном случае использован отредактированный кем-то вариант, выявленный в Российском государственном архиве социально-политической истории в Москве (Ф. 147. Оп. 2. Д. 11. Л. 17–25). Отличия с оригинальным текстом незначительные. Статья же «Савецкая ўлада і пытаньне аб адчыненьні ўнівэрсытэту на Беларусі» была впервые опубликована в № 6 журнала «Савецкае будаўніцтва» за 1928 год и отразила очевидную убежденность Владимира Ивановича в значимости научного изучения прошлого и настоящего университетского образования и всей истории высшей школы на белорусских землях. Увлеченность этим сюжетом, имевшим не только несомненную научную, но общественно-политическую значимость, была в те годы присуща и ближайшим коллегам Пичеты – Ф.Ф. Туруку, С.З. Каценбогену, А.А. Савичу. Но именно ректор придавал особое значение популяризации «идеи Университета», видя в ней успех реализации и социалистического, и национально-белорусского проектов. И всю жизнь гордился тем, что «новая пролетарская школа… мною создана, несмотря на постоянное карканье черных и белых ворон».

Восприятие и оценка публикуемых текстов за читателем.

## Савецкая ўлада і пытанне аб адчыненні ўніверсітэта на Беларусі*

Яшчэ ў часы нямецкай акупацыі прадстаўнікі савецкае грамадзянскасці і савецкая ўлада прымалі паасобныя меры для таго, каб забяспечыць Беларусь вышэйшай вучэбнай установай. Так, Беларускі Вобласны Камітэт пры Усерасійскім Савеце Сялянскіх і Рабочых Дэпутатаў хадайнічаў аб тым, каб эвакуаваны Нова-Александрыйскі інстытут сельскае гаспадаркі быў пераведзены ў г. Горкі, Магілёўскае губерні, дзе, як вядома, была сярэдняя сельскагаспадарчая вучэбная ўстанова. У той жа час Петраградскае аддзяленне Беларускага Нацыянальнага Камісарыята хадайнічала перад Камісарыятам Народнае Асветы аб замацаванні за Беларуссю эвакуаванага Юр'еўскага ўніверсітэта і аб пераводзе яго ў горад Віцебск або Смаленск, як гарады, якія не былі заняты немцамі.

Гэтыя праекты не ажыццявіліся па зусім зразумелых прычынах. Утворваць вышэйшую вучэбную ўстанову ў той час, калі большая частка Беларусі была занята немцамі, калі прыходзілася напружваць усе сілы для далейшай барацьбы за вызваленне Беларусі, было, зразумела, немагчыма. Вось чаму, у першыя часы, пытанне аб універсітэце не ўзнімалася савецкай уладай, як чарговая праблема ўнутранай палітыкі.

Калі ж Беларусь была вызвалена ад нямецкае акупацыі і калі звярнулася на Беларусь савецкая ўлада, то ў моц абставін пытанне аб універсітэце стала чарговым пытаннем. Савецкі ўрад павінен быў гэта пытанне зрабіць прадметам свае асаблівай увагі. Краіне, якая адстала ў культурных і эканамічных адносінах, патрэбны былі культурныя працаўнікі, якія маглі б прыйсці на дапамогу працоўным масам Беларусі. Без пралетарскай інтэлігенцыі, якая была б аддана савецкай уладзе, культурнае і эканамічнае адраджэнне Беларусі было немагчыма.

Гэта добра ўсвядоміла савецкая ўлада, якая лічыла неабходным прыняць адпаведныя меры да адчынення вышэйшае вучэбнае ўстановы ў краі, якая, зразумела, па сваіх задачах і мэце павінна была быць звязана з жыццём і ісці насустрач здавальненню бягучых рэальных запатрабаванняў. Вось чаму будучая вышэйшая ўстанова Беларусі павінна была рэзка адрозніваца ад старых універсітэтаў не толькі па сваёй канструкцыі, але і па складу студэнтаў. Будучая вышэйшая вучэбная ўстанова павінна была адчыніць свае дзверы для тых працоўных мас, якія ў эпоху царскага рэжыму не маглі паступіць у ўніверсітэт, бо дарога ў апошні была для іх зачынена.

З утварэннем савецкае ўлады на Беларусі мясцовы Наркамасветы выяўляў энергічную чыннасць у галіне народнае асветы. Фронт асветы лічыўся ўдарным, і на яго была звернута асаблівая ўвага. Урад Беларусі асігнаваў на народную асвету вельмі значныя сродкі.

Пасля эвакуацыі немц[аў]** Менску з Яраслаўля быў звернуты назад педагагічны інстытут. Урад Беларусі рэфармаваў яго ў вышэйшую вучэбную ўстанову, якая адыграла значную ролю ў гісторыі развіцця культуры на Беларусі. Персанал педагагічнага інстытута складаўся з мясцовых педагагічных сіл. Праграмы паасобных аддзяленняў да некаторай ступені былі падобнымі да праграм вышэйшых школ.

Адначасна сярэдняе тэхнічнае вучылішча рэфармуецца ў дзяржаўны палітэхнікум.

Трэба адзначыць, што для развіцця дзяржаўнага палітэхнікуму, які пры гэтым быў размеркаваны вельмі шырока, бо сярод факультэтаў яго быў не толькі агранамічны і меліярацыйны, але і факультэт тэхнічна-будаўнічы, не было ніякае глебы. Зразумела, на Беларусі адчувалася патрэба ў агранамічным і меліярацыйным факультэтах, але факультэты тэхнічна-прамысловага характару, пры адсутнасці буйнае прамысловасці на Беларусі, былі, безумоўна, непатрэбнымі.


В.И. Пичета. 1920-е годы

Абсталяваць палітэхнікум неабходнымі прадметамі, пры тагачасных умовах, пры адсутнасці сувязі з заграніцай, было, безумоўна, немагчыма. Палітэхнікум, з моманту свайго адчынення, апыніўся без кабінетаў і лабараторый, без якіх, ясна, ніякая падрыхтоўка да практычнае працы не з'яўлялася магчымай. Апрача таго, дзяржаўны палітэхнікум не меў неабходных навуковых сіл. Праўда, усе каштоўныя, з навукова-практычнага боку, сілы былі скарыстаны дзяржаўным палітэхнікумам, але гэтага было не даволі для таго, каб адпаведным навуковым спосабам забяспечыць усе кафедры педагагічнымі сіламі.

Усё ж такі і дзяржаўны палітэхнікум адыграў сваю значную ролю. Яго задачы і мэта былі звязаны з рэальным жыццём, а моладзь, пазбаўленая магчымасці паступіць у іншыя вучэбныя вышэйшыя ўстановы, напоўніла яго аўдыторыі і адносілася да свае працы з вялікім энтузіязмам. Апрача таго, палітэхнікум, ідучы насустрач жыццю і адчуваючы біццё пульсу рэвалюцыйнае эпохі, адчыніў дзверы для ўсіх працоўных.

Калі пасля нямецкай акупацыі Наркамасветы БССР прыступіў да арганізацыі сістэмы асветы, то пытанне аб вышэйшай школе ў Беларусі было пастаўлена ў першую чаргу. Наркамасветы БССР не быў у поўнай меры здаволены арганізацыяй, ні дзейнасцю абедзвюх вышэйшых вучэбных устаноў, як педагагічным інстытутам, гэтак і дзяржаўным палітэхнікумам. Дзеля гэтага Наркамасветы лічыў неабходным прыступіць да арганізацыі новых вышэйшых вучэбных устаноў – універсітэта, з аднаго боку, і вышэйшай агранамічнай школы, з другога.

Наркамасветы БССР, паставіўшы сабе задачу адкрыць у бліжэйшы час універсітэт, звярнуўся да Наркамасветы РСФСР за дапамогай у справе арганізацыі ўніверсітэта на Беларусі. Наркамасветы РСФСР мог даць дапамогу Беларускаму Наркамасветы ў сэнсе запрашэння выкладчыкаў, а таксама ў сэнсе абсталявання ўніверсітэта інвентаром і навуковымі прыладамі.

Для працы па арганізацыі ўніверсітэта Наркамасветы БССР было пастаноўлена арганізаваць асобную нараду групы асоб, на якіх ускласці ўсю падгатоўчую працу па арганізацыі ўніверсітэта.

* Тэкст артыкула адаптаваны да сучаснага правапісу.

** У квадратных дужках – выпраўленыя рэдакцыяй «БД» недакладнасці тэксту арыгінала.

Нарада застанавілася на г. Менску як найболей буйным тарговым, эканамічным і культурна-палітычным цэнтры Беларусі. Па месце свайго знаходжання Менск меў найбольш падыходзячыя ўмовы для адчынення ўніверсітэта.

Нарада лічыла неабходным утварэнне ўніверсітэта ў такім складзе, каб ён, з аднаго боку, ішоў насустрач бягучым запатрабаванням, развязвання якіх вымагала жыццё, а, з другога боку, дапамагаў бы ўздыму і развіццю краіны ў нацыянальна-культурным сэнсе. Нарада думала, што будучы ўніверсітэт, абсталяваны так, як абсталёўваюцца наогул вышэйшыя вучэбныя ўстановы, і надзелены здавальняючымі навуковымі сіламі, зможа замяніць і педагагічны інстытут, і дзяржаўны тэхнікум.

Прэзідыум ЦВК Саветаў Беларусі, абгаворваючы пытанне аб адчыненні ўніверсітэта на пасяджэнні ад 24 лютага 1919 года, прызнаў адчыненне дзяржаўнага ўніверсітэта ў Менску вельмі пажаданым. Для гэтае мэты з сум дзяржаўнага казначэйства быў асігнаваны 1.000.000 р. на першапачатковыя расходы.

Для развязвання пытання, у якой форме і ў чым павінна была выразіцца дапамога Наркамасветы РСФСР, была ўтворана спецыяльная камісія ў Маскве. Камісія, выпрацоўваючы вучэбныя планы, лічылася з асновамі савецкай палітыкі ў пытаннях вышэйшай школы, а таксама з нацыянальна-культурнымі і эканамічнымі асаблівасцямі Беларусі. Маскоўская камісія, арганізаваўшы асобнае журы па замяшчэнні кафедр у Беларускім дзяржаўным універсітэце, намеціла шэраг вучоных, якія згадзіліся працаваць у будучым Беларускім дзяржаўным універсітэце.

Адначасна ішла дзейная праца і ў Менску. Губернскі аддзел народнае асветы, лічачы неабходным адкрыць агранамічны факультэт у ўніверсітэце, бо гэтага неадкладна вымагала сельская гаспадарка Беларусі, аддаўшы для патрэб агранамічнага факультэта значны маёнтак Лошыца ў 6 вярстах ад Менска.

На жаль, уся гэтая арганізацыйная праца была часова спынена, дзякуючы польскай акупацыі летам 1919 года. Акупацыйная ўлада адносілася адмоўна да ідэі ўніверсітэта ў Менску. Зразумела, што аб гэтым не магло быць і гутаркі. З другога боку, прызнанне неабходнасці адчынення ў Менску ўніверсітэта ўжо так глыбока прайшло ў шырокія грамадскія колы, што групай мясцовых выкладчыкаў і спецыялістых былі арганізаваны вышэйшыя курсы для студэнтаў-юрыстых, тэхнікаў, медыкаў і для скончыўшых сярэднюю вучэбную ўстанову, якія, з прычыны вайны, не маглі папасці ў вышэйшыя вучэбныя ўстановы. Акупацыйная ўлада была прымушана згадзіцца на адчыненне курсаў, хоць і глядзела на іх з падазронасцю. Зразумела, гэтыя курсы былі сурагатам універсітэта, і, апрача таго, яны ішлі насустрач навукова-вучэбным запатрабаванням буржуазнай моладзі, бо адчыненыя камісіяй курсы для падрыхтоўкі рабочай і сялянскай моладзі, зразумела, былі зачынены.

У часы польскай акупацыі шырока разгарнуў сваю працу педагагічны інстытут, які меў у сябе значную колькасць сялянскай моладзі. Апрача таго, у спіску слухачоў педагагічнага інстытута лічылася нямала вопытных дзеячаў па народнай асвеце, як працаўнікоў вясковай школы. З вялікімі труднасцямі аднавілася педагагічная праца ў інстытуце, бо акупацыйная польская ўлада адносілася да гэтага адмоўна. Наваколь інстытута аб'ядналіся беларускія культурныя і рэвалюцыйныя сілы, якія прымалі актыўны ўдзел у партызанскім руху супроць палякаў. У часы польскай акупацыі ўпершыню пачалі чытацца лекцыі ў педагагічным інстытуце на беларускай мове.

11 ліпеня 1920 г. горад Менск поспехамі і сіламі Чырвонай арміі быў вызвален ад акупацыйных войск. З прыходам у спустошаны і разбураны Менск савецкай улады аднавілася дзейнасць універсітэцкай камісіі.

Перш за ўсё Менская камісія імкнулася дабіцца заканадаўчага акта аб адчыненні ў Менску ўніверсітэта ў складзе факультэтаў філалагічнага, грамадскіх навук, медычнага, прыродазнаўчага і агранамічнага, таму што для гэтага мелася рэальная магчымасць.



В.И. Пичета с профессорским коллективом БГУ. 1920-е годы

Маскоўская камісія дапамогі па арганізацыі ўніверсітэта на працягу жніўня – верасня энергічна працавала па пераглядзе вучэбных планаў і разглядзе кандыдатур на вольныя кафедры. Перамовы з вучонымі спецыялістамі паказалі, што не будзе недахопу кваліфікаваных навуковых сіл, і што многія навуковыя працаўнікі згодны прыехаць на Беларусь.

Наркамасветы РСФСР, які ўзяў на сябе кіраўніцтва арганізацыйнай працай па адчыненні ў Менску ўніверсітэта, думаў, што для найболей паспяховага ажыццяўлення адчынення ўніверсітэта неабходна арганізаваць тройку ўдарнага характару, якой неабходна даць усе правы па арганізацыі ўніверсітэта, з правам запрашаць на нарады тых асоб, якія, па погляду тройкі, з'яўляюцца неабходнымі, як кансультанты пры ажыццяўленні ўскладзенай на тройку задачы. Наркамасветы РСФСР у склад тройкі вызначыў Грынберга З.Г., Пічэту У.І. і Турука Ф.Ф.

Наркамасветы БССР згадзіўся на арганізацыю тройкі на правах праўлення, а ў Менску была арганізавана таксама спярша тройка, а потым пяцёрка, пры ЦВК Саветаў Беларусі, пад старшынствам праф. Смаленскага ўніверсітэта Г.С. Гурвіча. Абедзве калегіі мелі паміж сабой шчыльную сувязь, і праца па арганізацыі ўніверсітэта ішла даволі хуткім шляхам, не сустракаючы на сваім шляху ніякіх перашкод.

Арганізаваная ў Маскве тройка звярнулася за дапамогай да некаторых маскоўскіх спецыялістых, каб разгледзець і распрацаваць вучэбныя планы. Апрача таго, Маскоўская тройка энергічна працавала як па куплі кніг

для ўніверсітэцкае бібліятэкі, так і неабходнага навуковага абсталявання для прыродазнаўча-гістарычнага і медычнага факультэтаў.

Менская пяцёрка была занята на месцах працай гаспадарчага характару і падрыхтоўкай універсітэцкіх будынкаў для пачатку заняткаў з восені 1921 года. Апрача таго, Менская пяцёрка энергічна працавала па ўтварэнні ў Менску рабочага факультэта, заняткі на якім павінны былі пачацца ў хуткім часе, а разам з гэтым і самы ўніверсітэт, афіцыйнае адчыненне якога адкладалася на восень, пачаў бы сваю працу.

Камісія прафесараў, пад старшынствам У.І. Пічэта, распрацоўвала часовыя вучэбныя планы факультэтаў: рабочага, грамадскіх навук, медычнага, сельскагаспадарчага і фізічна-матэматычнага. Распрацоўваючы гэтыя планы, камісія мела на ўвазе мясцовыя патрэбы і адвяла значнае месца беларусазнаўству і мясцовым культурам.

Ударная тройка лічыла неабходным і арганізацыю цыкла пазашкольнага, які павінен быў падрыхтаваць педагогаў і лектараў для пазашкольнае аўдыторыі.

Аўтары вучэбных планаў, жадаючы даць будучым студэнтам, педагогам і грамадскім працаўнікам асновы навуковага светапогляду, аддалі ў праграмах значнае месца як прыродазнаўству, так і філасофскаму матэрыялізму. Зразумела, і ў праграмах прававога і эканамічнага аддзяленняў было аддадзена значнае месца Беларусі ў гістарычна-юрыдычных і эканамічных адносінах.

Трэба прызнаць цяпер гэтыя планы няўдалымі: яны адзначаліся вялікай шматпрадметнасцю. Апошняя павялічвалася яшчэ больш тым, што прыходзілася ўводзіць новыя прадметы, якія мелі выключна мясцовае, краязнаўчае значэнне. Недахопы гэтага вучэбнага плана выявіліся ў першы год існавання ўніверсітэта. Было зусім ясна, што ён патрабуе перагляду і змены. Складаючы новыя вучэбныя планы, камісія прафесараў аддала значнае месца семінарскім заняткам, лічачы апошнія больш мэтазгоднымі, чымся лекцыі.

Распрацоўка вучэбных планаў медычнага факультэта пачалася яшчэ ў кастрычніку 1920 г., калі праф. Мінор падаў дакладную запіску, у якой вызначаў агульныя ўмовы пабудовы медычнага факультэта ў Менску. Перш за ўсё аўтар лічыў неабходным абсталяваць належным чынам усе лабараторыі ўніверсітэта, бо іначай універсітэт не будзе мець кваліфікаваных выкладчыкаў.

Паездка маскоўскіх прафесараў у Менск у студзені 1920 года выявіла поўную магчымасць адчынення медычнага факультэта.

Адчыненне медычнага факультэта было дэкларавана на 2-м Усебеларускім з'ездзе саветаў у снежні 1920 года. Нарэшце, Калегія Навуковага Сакратарыяту Народнага Камісарыята Асветы РСФСР ад 18 жніўня 1920 г. пастанавіла ўтварыць у Менску Дзяржаўны Універсітэт, у складзе факультэтаў: рабочага, прыродазнаўчага, медычнага, агранамічнага і літаратурна-філалагічнага.

Нарэшце, арганізацыйная камісія пры дапамозе А.Л. Калантара таксама выпрацавала план сельскагаспадарчага факультэта з аддзяленнямі: агранамічным, лясным і балотна-лугавым. У сваю чаргу, лічылася, што агранамічнае аддзяленне пры далейшай спецыялізацыі ўтворыць цыклы: земляробства, жывёлаводства, рыбаводства, пладаводства, гародніцтва і пчалярства. Апрача таго, намячалася адчыненне навукова-даследчага інстытута.

Арганізацыйная камісія лічыла таксама неабходным адчыненне пры беларускім дзяржаўным універсітэце навукова-даследчага інстытута беларуск[ай] і яўрэйск[ай] культур.

Адначасна з апрацоўкай вучэбных планаў на асноўных факультэтах Маскоўская тройка звярнула ўвагу на распрацоўку вучэбнага плана рабочага факультэта, арганізацыі якога яна надавала вялікае значэнне.

З пачатку красавіка ўся падрыхтоўчая праца ў Маскве па арганізацыі Беларускага ўніверсітэта ў Менску была скончана. Арганізацыйная тройка лічыла неабходным азнаёміць са сваёй працай як беларускі ўрад, у асобе старшыні ЦВК і Саўнаркома, а таксама і Камісара Народнае Асветы, так і мясцовую ўніверсітэцкую камісію.

Красавіковая паездка ў Менск мела вялізнае значэнне для далейшае працы па адчыненні на Беларусі ўніверсітэта. Прадстаўнік маскоўскай камісіі Ф.Ф. Турук, у прэзідыуме ЦВК Беларусі, зрабіў даклад адносна падрыхтоўчае працы



Профессор В.И. Пичета со своими аспирантами. Вторая половина 1920-х годов

па арганізацыі ўніверсітэта, якая пачалася для выканання пастановы 2-га Беларускага з'езду саветаў.

Прэзідыум ЦВК, заслухаўшы даклад сябра часовага праўлення Ф.Ф. Турука, зрабіў наступную пастанову: Прызнаючы, што адчыненне ўніверсітэта ў гор. Менску з'яўляецца справай першараднае дзяржаўнае важнасці і ўпарта вымагаецца культурнымі, эканамічнымі і палітычнымі інтарэсамі рабоча-сялянскага жыхарства Беларусі, прэзідыум ЦВК, для спаўнення даручэння 3-е сесіі ЦВК саветаў Беларусі ад 17-га красавіка, пастанаўляе:

1. Пацвердзіць раней выданае пастанаўленне аб адчыненні у гор. Менску Беларускага Дзяржаўнага Універсітэта.

2. Адчыніць універсітэт у складзе факультэтаў: рабочага, грамадскіх навук, медычнага, сельскагаспадарчага і фізічна-матэматычнага.

УВАГА. З прычыны цэльнага раду спецыфічных асаблівасцей Беларусі, у санітарна-гігіенічных адносінах, а таксама ў сельскагаспадарчых, і ў мэтах падрыхтоўкі мясцовых высокакваліфікаваных лекараў і аграномаў, у якіх адчуваецца гостры недахоп, звярнуць асаблівую ўвагу на арганізацыю медычнага і сельскагаспадарчага факультэтаў.

3. Пры Беларускім дзяржаўным універсітэце ўстанавіць навукова-даследчы інстытут беларускае і яўрэйскае культуры.

4. Прызнаць адчыненне ўніверсітэта ў Менску тэрміновай і ўдарнай задачай і прапанаваць усім наркамам, Сав. нар. гаспадаркі і іншым установам рэспублікі здавальняць вымаганні ўніверсітэцкае камісіі ў першую чаргу і аказваць Наркамасветы ўсякую дапамогу, неабходную для паспяховага выпаўнення гэтае задачы.

Пастанова прэзідыума ЦВК па сваёй прынцыповасці мела вялікае значэнне і ў далейшым зрабіла ўплыў на ўскарэнне ходу работы па адчыненні ўніверсітэта ў Менску.

Пастанова ЦВК ад 17-га красавіка аб адчыненні ў Менску ў бліжэйшую чаргу агранамічнага факультэта ўзняла пытанне аб узаемаадносінах беларускага ўніверсітэта і Беларускага палітэхнікума.

Было зусім ясна, што пры існаванні Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта, Беларускі палітэхнікум павінен стаць у тыя ці іншыя адносіны да Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта. Пры гэтым і самы палітэхнікум, які адчыніўся ў эпоху першых гадоў савецкае ўлады і які быў нездавальняюча абсталяваны, адчуваў патрэбу ў рэфармаванні, якое змяніла б Беларускі палітэхнікум у сапраўдную вышэйшую тэхнічную ўстанову.

18-га красавіка ў памяшканні Беларускага дзяржаўнага палітэхнікума, педагагічны персанал політэхнічнага інстытута, разам з сябрам часовага праўлення Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта абгаварвалі пытанне аб узаемаадносінах будучага ўніверсітэта да Беларускага дзяржаўнага палітэхнікума.

Па пытанні аб узаемаадносінах Беларускага ўніверсітэта і Беларускага палітэхнікума была прынята наступная рэзалюцыя:

1. Прымаючы пад увагу, што ў Беларускім дзяржаўным палітэхнікуме, існаванне якога выклікана патрэбамі краю, выкладанне вядзецца па вучэбных планах В.Т.Ц.У., што ў палітэхнікуме налічваецца добра падрыхтаваных студэнтаў звыш 400, што тры факультэты маюць другія курсы і могуць у бліжэйшы час даць спецыялістых з вышэйшай асветай, што каля палітэхнікума згуртавана каля 40 выкладчыкаў з вышэйшай асветай і з вялікім практычным стажам, прычым некаторыя з іх маюць навуковыя працы, што інстытут у сучасны момант у некаторай частцы абсталяваны вучэбнымі кабінетамі, а частка іх знаходзіцца ў стадыі арганізацыі, – прызнаць вельмі пажаданым захаванне палітэхнікума і далейшае яго развіццё як вышэйшае тэхнічнае ўстановы на Беларусі.

